# «Наспела тэма для сур'ёзнай размовы з пакаленнем,

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

«Добра працуе прэс-сакратар. Мы яшчэ нічога не зрабілі, а «Пул першага» ўжо забіты навінамі», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Выкарыстоўваючы свой выкладчыцкі вопыт, кіраўнік дзяржавы арыентаваў аўдыторыю на сумленную размову, без фармалізму. Разам з тым тэмы ўзнімаліся сур'ёзныя.

### Мэта — ператварыць Беларусь у гарачую кропку

Звяртаючыся да прысутных, беларускі лідар падкрэсліў, што сёння ў Віцебскага ўніверсітэта асаблівы дзень. І не толькі таму, што сюды прыехаў Прэзідэнт. «Я, мабыць, упершыню ў вашай ВНУ. Хаця, улічваючы, што ў нас паўсотні ВНУ і іншых навучальных устаноў, нават за маё доўгае прэзідэнцкае жыццё не так проста іх аб'ехаць і наведаць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што падчас нарады з саветам рэктараў у лютым папрасіў спланаваць наведванне ВНУ як у сталіцы, так і ў рэгіёнах.

Акрамя таго, па словах Прэзідэнта, наспела тэма для сур'ёзнай размовы з пакаленнем, якому трэба будзе прадоўжыць гістарычны шлях Беларусі ў свеце, што змяняецца з шалёнай хуткасцю. «Свет змяніўся, падзеі адбываюцца хутка — тэмп касмічны. Вы, мабыць, адчуваеце такі тэмп? Калі не, то, стаўшы студэнтамі, ужо адчулі. Тое, што на ўчарашнія інавацыі сёння мы глядзім як на музейны экспанат, вы таксама адчулі. Размова не толькі аб навуцы, тэхналогіях і рэальным сектары эканомікі. Гэта датычыцца і сацыяльнай сферы, адносін паміж людзьмі ў грамадстве», — адзначыў ён. Аднак, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, праблема не ў хуткасці, а ў тым, што краіны і народы ўцягнуты ў гонку за валоданне тэхналогіямі. «Нічога новага. Усё нібыта па-ранейшаму. Але з нюансамі, — заўважыў ён. — Цяперашняя барацьба за сусветнае тэхналагічнае лідарства, як і гонка ўзбраенняў у другой палове мінулага стагоддзя, зноў падвяла свет да краю прорвы. У той ці іншай частцы свету ўжо іскрыць, дзесьці супрацьстаянне ідзе са зброяй у руках. Вельмі шкада, што гэта зусім побач з намі. І нават не побач, а ў нас. Мы разумеем: тэхналагічныя манапалісты ў асобе заходніх дзяржаў зробяць усё, каб не дапусціць трансферу ведаў і тэхналогій у дзяржавы, якія развіваюцца». Па словах беларускага лідара, для калектыўнага Захаду гэтыя краіны — пастаўшчыкі працоўнай сілы і рынкі збыту. Нешта падобнае на неакаланіялізм у чыстым выглядзе. «Трэба разумець, што ўвядзенне незаконных санкцый, розныя рэстрыкцыі, росквіт шавіністычных, нацыяналістычных і іншых разбуральных ідэалогій на Захадзе — гэта звёны аднаго ланцуга, падпарадкаваныя адзінай мэце — усімі сіламі захаваць светапарадак, заснаваны на іх правілах. Правілах, якія забяспечваюць ім сытае жыццё за наш з вамі кошт і кошт іншых краін, якія развіваюцца. І нас уцягваюць у дадзенае супрацьстаянне. Пакуль у сферах эканомікі, навукі і тэхналогій. Але мэта — ператварыць Беларусь у яшчэ адну гарачую кропку на карце свету», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

### «Паспрабуюць больш жорстка з намі абысціся — будзе адказ»

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што многія часта захапляюцца Злучанымі Штатамі Амерыкі, бо многія тэхналогіі зараджаліся менавіта там. Аднак, па яго словах, ёсць невялікі нюанс. «Друкуюць грошы — яны могуць укінуць у развіццё любыя грошы. Яны дасягнулі за кошт гэтага пэўных рэсурсаў. Яны, як пыласос, з усяго свету выцягвалі найлепшыя розумы, плацілі ім добрыя грошы, і яны развівалі гэтыя тэхналогіі», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. У той жа час, па словах беларускага лідара, ЗША вядуць войны і ўцягваюць у канфлікты іншыя краіны. У прыклад ён прывёў Германію: «Ужо прадпрыемствы, якія працавалі ў Германіі, пайшлі натоўпам у Злучаныя Штаты Амерыкі. Чаму? Таму што яны стварылі там добрыя ўмовы. І таму што яны пасля Другой сусветнай вайны сталі шмат у чым манапалістамі і магутнай дзяржавай — за наш кошт. За наш кошт яны вырабляюць амаль трэць сусветнага багацця. І пакуль долар яны манапалізавалі і друкуюць, да таго часу яны будуць перадавымі». Аднак Прэзідэнт звярнуў увагу, што з'яўляюцца іншыя буйныя гульцы, накшталт Кітая і Індыі, якія не згодны з цяперашнім светаўладкаваннем. Часам ЗША папракаюць іх у тым, што яны крадуць тэхналогіі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта не навіна. Ён нагадаў, як стваралася ядзерная зброя. Навукоўцы з ЗША, якія працавалі над гэтым, узялі распрацоўкі з Германіі. А Савецкі Саюз прыклаў намаганні, каб ЗША не сталі манапалістамі ў гэтай сферы. «А калі б гэтага не было? Калі б сёння не было савецкага ядзернага шчыта, які сканцэнтраваны ў Расіі, — нас бы не было. Сёння яны не ведаюць, што з намі рабіць: паспрабуюць больш жорстка абысціся — будзе адказ ядзерным ударам. Ад гэтага загіне ўся планета. А гінуць яны больш не жадаюць, таму што ў іх сытае і добрае жыццё — у тых, хто прымае гэтыя рашэнні», — пераканаць Аляксандр Лукашэнка.

### «Я хачу, каб вы разумелі ўсю сур'ёзнасць гістарычнага моманту»

Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння стаіць задача ў паскораным фармаце правесці новую навукова-тэхнічную рэвалюцыю, пакуль нас не ўцягнулі ва ўзброенае супрацьстаянне. «Толькі ў такіх умовах з'явіцца шанц захавацца як дзяржава і не дапусціць вялікай вайны на нашай зямлі. Гэта суровая праўда жыцця. І я хачу, каб вы разумелі ўсю сур'ёзнасць гістарычнага моманту. Паколькі заўтра вам працаваць на вытворчасці ці ў лабараторыі, рухаць наперад навуковую думку, мы разлічваем на вас. Разлічваем, што вы будзеце гатовы прыкласці каласальныя намаганні для дасягнення пастаўленай перад дзяржавай мэты», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму для першай падобнай сустрэчы са студэнтамі абраны менавіта Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава. Аказваецца, кіраўнік дзяржавы яшчэ ні разу не наведваў гэту ВНУ. «З іншага боку, я рады, што наша сустрэча праходзіць менавіта цяпер — у 80-годдзе вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Віцебскі ўніверсітэт займае асаблівае месца ў нашай гістарычнай памяці. Сярод выпускнікоў тры Героі Савецкага Саюза — Канстанцін Антонавіч Абазоўскі, Міхаіл Амосавіч Высагорац і Пётр Міронавіч Машэраў, імя якога носіць універсітэт. «І мяне радуе, што вы шануеце памяць сваіх папярэднікаў, захоўваеце пераемнасць пакаленняў, традыцыі. Вельмі хацелася б, каб вы трымалі ўзровень найлепшых ВНУ краіны і блізкага замежжа. Патэнцыял у вас сур'ёзны, і, думаю, вы можаце значна дадаць як у навукова-адукацыйнай дзейнасці, так і ў выхаваўчай рабоце», — падкрэсліў беларускі лідар.

### «Імкніцеся ў гэты час узяць максімум»

«Дарагія сябры! Пачынаецца новы навучальны год. Вы заўважылі, як літаральна за дзень уся краіна ды і ваш горад прыйшлі ў рух. Пачаліся ўрачыстыя лінейкі, хутка празвініць традыцыйны першы званок і больш за мільён школьнікаў і каля пяцісот тысяч навучэнцаў каледжаў і студэнтаў ВНУ пачнуць заняткі. Фактычна з сённяшняга дня мы ўсе пачынаем жыць па новым навучальным календары. Можа, у студэнтаў ужо не так яскрава адчуваецца пачатак новага навучальнага года ці, як вы кажаце, навучальнага семестра. Вы — людзі дарослыя. Але, упэўнены, гледзячы на малых з букетамі кветак, кожны з вас з цеплынёй успамінае школьныя дні, адкуль мы ўсе з вамі выйшлі», — сказаў беларускі лідар. Ён павіншаваў студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў з Днём ведаў. «Няхай гэты навучальны год будзе займальным, напоўненым новымі адкрыццямі, станоўчымі эмоцыямі, радасцю сустрэч з цікавымі людзьмі. Насычайцеся, як губка, ведамі і кампетэнцыямі, каб літаральна праз некалькі гадоў стаць прафесіяналамі сваёй справы, заняць годнае месца ў жыцці», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што студэнцтва — самы складаны перыяд жыцця. «Калі вы скончыце ВНУ, будзе значна лягчэй. Вы будзеце займацца сваёй любімай справай, спадзяюся, што любімай. Вы будзеце поўнасцю сканцэнтраваны на ёй. Вы будзеце здаваць экзамены, якія вам патрэбныя. У ВНУ ж так бывае: прыходзіш на экзамен толькі дзеля залікоўкі», — заўважыў Прэзідэнт. Ён успомніў, што часам здаецца, што не ўсе прадметы падчас вучобы патрэбны. «Імкніцеся ў гэты час узяць максімум», — параіў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, часта не хапае ведаў менавіта па тых прадметах, якія здаваліся «дзеля залікоўкі».

### «Падручнік — гэта ікона». У чым яго роля для жыцця краіны

У сувязі з гэтым беларускі лідар нагадаў сваё патрабаванне пра якасныя і зразумелыя падручнік. Гэтае пытанне, як вядома, пастаянна знаходзіцца ў полі зроку Прэзідэнта. Па яго словах, падручнік — гэта ікона. «Падручнік — гэта галоўнае. Там павінна быць канцэнтрацыя ўсіх ведаў па прадмеце», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Акрамя таго, заўважыў беларускі лідар, калі матэрыял у падручніку выкладзены складана і кожны абзац трэба перачытваць некалькі разоў, каб зразумець сутнасць, то і цікавасць да прадмета губляецца. Менавіта па гэтых прычынах кіраўнік дзяржавы пільна сочыць за якасцю падручнікаў і патрабуе іх перарабляць, калі гэта трэба.

«Рэвалюцыі ў адукацыі скончыліся. Мы вельмі шмат навацый за гэтыя гады ўкаранялі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што пасля развалу Савецкага Саюза трэба было давесці да ладу ўсе сферы, уключаючы эканоміку, адукацыю і іншае. У такой сітуацыі найперш трэба было стварыць падручнікі, якія найбольш падыходзяць для беларускіх рэалій. У якасці прыкладу Прэзідэнт прывёў падручнік па эканоміцы, які выкладаў не тую эканамічную мадэль, якая развівалася ў краіне. «Трэба вучыць людзей таму, што ім трэба», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беларускую адукацыю часта крытыкуюць. Але разам з тым многія краіны просяць і хочуць атрымаць сабе «беларуса з беларускай адукацыяй». І гэта датычыцца розных сфер. Па словах Прэзідэнта, паказальна і тое, што ў Беларусі цяпер вучацца больш за 30 тысяч замежных студэнтаў. У тым ліку з Кітая, дзе найвышэйшы ўзровень адукацыі. Паспяхова рэалізоўваюцца і сумесныя адукацыйныя праграмы беларускіх і кітайскіх універсітэтаў. Гэта дазваляе краінам абменьвацца досведам і кампетэнцыямі. «Яны не грэбуюць вучыцца па тых кірунках, дзе ўмеюць нешта рабіць. І добра ўмеюць. Яны разумеюць, што ў Беларусі нешта асаблівае ёсць — давайце возьмем і сабе прыцягнем», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння ідзе сур'ёзная барацьба за лідарства. Гэтая барацьба ідзе не толькі ў медыйнай прасторы ці эканоміцы, але і на полі бою. «Вайна ва Украіне — гэта таксама наша праблема. І ніякая там ужо не вайна паміж Расіяй і Украінай. Там вайна паміж Расіяй і тымі дзяржавамі, якія Расіі дапамагаюць (хоць няшмат, але дапамагаюць), і натаўскімі дзяржавамі, як мінімум. Таму нам трэба нямала зрабіць, каб гэтыя страшныя працэсы спыніць», — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што свет развіваецца па сваіх законах і будзе шматпалярным. Гэта вельмі складаны і напружаны час. І гэты цяжар кладзецца на плечы маладых людзей, у тым ліку і тых, хто знаходзіцца ў зале ВДУ імя П. М. Машэрава.

«Хочаце вы гэтага ці не, вам прыйдзецца жыць у гэтым свеце. Вам яго будаваць. Таму я заўсёды кажу з вышыні свайго досведу: лепей жыць бядней, чым ваяваць, як гэта адбываецца за межамі нашай краіны. Я казаў, што вайна ідзе не там, яна ідзе ў нас. І яшчэ, як Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі, хачу вас засцерагчы ад гэтага, каб вы не адчулі ваеннага напружання», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што ў найбліжэйшы час: пяць—дзесяць гадоў — трэба дапамагчы моладзі ўзяць краіну ў свае рукі, каб і ў наступных пакаленняў былі добрыя ўмовы для жыцця.

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь сёння жыве ва ўмовах незаконных варварскіх санкцый. Нягледзячы на гэта, дзяржава развіваецца і людзі могуць жыць камфортна. «Трэба не забывацца, што гэта ўсё створана нашымі з вамі рукамі. Гэта вы ствараеце, вашы бацькі. Будзе большая аддача ў эканоміцы — ніхто не раскрадзе, гэта будзе ваша. Але для гэтага трэба проста працаваць», — параіў моладзі беларускі лідар. Ён таксама параіў акуратна абыходзіцца з сусветным павуціннем. «Інтэрнэт — гэта найвялікшы здабытак чалавецтва. Хочам мы гэтага ці не. Але гэта вельмі сур'ёзная зброя ў руках тых, хто яе стварае, і тых, хто ёй карыстаецца», — канстатаваў беларускі лідар. Паводле яго слоў, замацаваць у маладых людзей правільныя паняцці і каштоўнасці — задача выкладчыкаў. І даў ім параду: трэба тлумачыць студэнтам перавагі і недахопы, даваць глебу для разважанняў.

## «ДАВАЙЦЕ ШЧЫРА ПАГАВОРЫМ»

**На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка абмяркоўваў пытанні і праблемы адукацыі з выкладчыкамі падчас Рэспубліканскага педагагічнага савета. У Дзень ведаў ён разважаў на гэтыя тэмы з тымі, для чыёй карысці і вырашаюцца гэтыя праблемы — з навучэнцамі. Маладыя людзі не ўпусцілі магчымасці і спыталі ў Прэзідэнта ўсё, што іх цікавіла. «Давайце шчыра пагаворым, калі сустрэліся», — пажадаў кіраўнік дзяржавы.**

### Дзе лепей: у сталіцы ці ў рэгіёне? Што раіць Прэзідэнт абітурыентам

11-класнік ліцэя ВДУ Вадзім Пахалок, які марыць стаць інжынерам, спытаў у Прэзідэнта парады — куды лепей паступаць: у сталічны ўніверсітэт або рэгіянальны і ці адрозніваецца там узровень падрыхтоўкі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ён сам вучыўся ў рэгіянальных ВНУ — Магілёўскім універсітэце імя Куляшова, а затым у сельскагаспадарчай Акадэміі ў Горках. Паводле яго слоў, галоўным матывам было не месцазнаходжанне ўніверсітэта, а шчырае жаданне зрабіць нешта добрае для людзей, якія жывуць у сельскай мясцовасці. «Я разумеў, што толькі ў вёску павінен паехаць і ім нешта зрабіць. І я папрасіў сам: «Накіруйце мяне ў самы бедны калгас». Я кажу: «Я туды паеду, я вам абяцаю, што гэта будзе найлепшая гаспадарка», — успомніў Аляксандр Лукашэнка. Для таго каб выканаць сваё жаданне працаваць у сельскай гаспадарцы, прыйшлося паступаць у сельскагаспадарчую акадэмію. «Я заканчваў рэгіянальныя ВНУ і служыў сваёй краіне», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, няважна, дзе вучыцца. Праграмы, метадычкі, іншае практычна аднолькавыя па той ці іншай спецыяльнасці. «Выкладчыкі розныя, вядома, але я ўпэўнены, што ў рэгіянальных ВНУ выкладчыкі не горшыя, чым у мінскіх ВНУ», — адзначыў ён. Магчыма, нават лепш, таму што, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, у сталіцы з-за канкурэнцыі складаней замацавацца і многія едуць у рэгіёны, каб спакойна займацца навукай. Паводле слоў Прэзідэнта, у Віцебску створана выдатная вытворчая база. Рэгіён прамысловы, таму малады спецыяліст зможа без праблем знайсці сабе работу на любым прадпрыемстве.

Галоўнае — жаданне. «Калі ў цябе ёсць гэтае жаданне — боскае жаданне, не проста «я зараз скончу ВНУ, для сябе чагосьці зраблю і буду багатым» (гэта таксама нядрэнна, калі для сябе, для сям'і нешта зробіш). Галоўнае, каб ты хацеў людзям прынесці карысць», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка параіў маладым людзям не парыцца і не рвацца ў Мінск. «У Мінску цесна, ты чужы», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы падзяліўся сваім вопытам — як чалавек, які нарадзіўся ў вёсцы і сёння аддае перавагу жыццю за горадам. «Мая вам парада: не рвіцеся ў Мінск. Будзе ў вас жаданне, атрымаеце вы пэўныя веды — вас заўсёды заўважаць. Таму што ў нас жудасны дэфіцыт на такіх таленавітых людзей, якія хочуць нешта зрабіць... Не кажу для Радзімы, для краіны — для людзей, — заўважыў беларускі лідар. — Веды можна атрымаць і ў Беларускім дзяржуніверсітэце, і ва ўніверсітэце імя Машэрава».

Кіраўнік дзяржавы таксама заўважыў, што не трэба спяшацца адрывацца ад сям'і, ад бацькоў, якія шмат зрабілі і ўклалі для таго, каб маладыя людзі маглі атрымліваць вышэйшую адукацыю. «Мая табе парада. Калі б ты быў маім дзіцем, я б табе сказаў: заканчвай, вось ёсць рэгіянальная ВНУ, вось на тым прадпрыемстве... Добра, што ў цябе фізіка і матэматыка аснова, нам такіх маладых людзей заўсёды не хапае. І ты ў сваім жыцці знойдзеш дарогу», — параіў Аляксандр Лукашэнка. Тым больш, паводле яго слоў, разумных, талковых навучэнцаў у нашай краіне не губляюць. Дзейнічаюць фонды Прэзідэнта па падтрымцы адораных навучэнцаў, лаўрэатаў стыпендый якіх ведаюць і бачаць. «Мы не губляем разумных маладых людзей, — падкрэсліў беларускі лідар. — Галоўнае цяпер — атрымаць гэтую базу. Гэта цяжка, часам нудна. Часам адчуваеш, што, можа, і не трэба. Усё гэта патрэбна. Таму вучыцеся».